МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АДУКАЦЫЯ І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ АДРАДЖЭННЕ

Тэзісы навуковых дакладаў
на Міжнароднай канферэнцыі
(25-26 кастрычніка 1994 г., г.Мінск)

МІНСК 1994

В.Кнорын, латыш па нацыянальнасці. Калі раней ён на пытанне аб беларускай мове глядзеў як на нацыяналістычную з'яву, дык пазней выступаў за правадзіцяці выхоўвацца і вучыцца ў школе на сваёй роднай (матчынай) мове і не дапускаў думкі пра сумеснае выхаванне дзяцей, якія гавораць на розных мовах, бо такі інтэрнацыяналізм , на яго думку, быў бы задушэннем свабоднага выхазання. У школах, гаворыў ён, трэба даць беларускай мове такія ж правы, якімі карыстаецца руская мова, бо гэта будзе мець велізарнае палітычнае і міжнароднае значэнне.

Пры такіх адносінах дзяржаўных і партыйных лідэраў да беларускага пытання стала значна лягчэй праводзіць нацыянальную адраджэнскую палітыку ў народнай асвеце. Дапамагала і тое, што кіравалі, працавалі ў наркамаце асветы БССР такія вядомыя дзеячы, як У.Ігнатоўскі, А.Баліцкі, Я.Каранеўскі. У іх навуковых працах, артыкулах, публічных выступленнях на з'ездах, канферэнцыях педагогі знаходзілі вычарпальныя адказы на самыя надзенныя пытанні стварэння беларускай нацыянальнай школы. Вынік нацыянальна-культурнага Адраджэння ў сферы асветы быў навідавоку. Калі ў 1921 г. у рэспубліцы функцыянавалі на беларускай мове толькі адзінкі школ і дашкольных устаноў, дык праз год іх працавала ўжо каля 20%. А ў 1923 г. цалкам на беларускай мове функцыянавала 60% пачатковых школ.

Больш цяжкасцяў існавала з пераходам на беларускую мову навучання сямігадовых школ, што ў значнай ступені тлумачылася і кансерватыўнасцю поглядаў многіх настаўнікаў. Пазітыўныя зрухі намеціліся ў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школе. Станоўча, што разам з пераходам на беларускую мову яны ўводзілі ў вучэбны план гісторыю і геаграфію Беларусі як прадмет выкладання. Першыя дасягненні ў стварэнні нацыянальнай асветы і школы, праблемы, што існавалі ў гэтай галіне, пастаянна асвятляліся на старонках навуковай і публіцыстычнай літаратуры, у перыядычным друку. З 1924 г. у Мінску стаў выходзіць часопіс "Асвета".

*Валерый Болбас*

## АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

*г.п.Акцябрскі*

*Гомельскай вобл.*

Наспеўшая патрэба рэфармавання школы на сучасным пераломным этапе развіцця грамадства вымушае скіроўваць увагу на аналагічныя перыяды ў гісторыі беларускага народа. Мноствам праяў і падзей пераклікаецца з сённяшняй рэчаіснасцю эпоха Адраджэння з яе рэвалюцыйным у поглядах аб прызначэнні чалавека на зямлі, з разбурэннем многіх устаяўшыхся стэрэатыпаў светапоглядам.



У педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння найбольшую ўдзельную вагу займалі выхаваўчыя ідэі, у прыватнасці ідэі маральнага выхавання. Зыходзячы з асноўных задач народнай педагогікі, сінтэзуючы дасягненні антычнай і хрысціянскай этыкі, адчуваючы заходнееўрапейскі рэнесансавы ўплыў, айчынныя педагогі-мысліцелі прыходзяць да высновы, што галоўнай задачай грамадства і сэнсам жыцця чалавека з'яўляецца фармаванне добрачыннай, цнатлівай асобы. У адрозненне ад заходнееўрапейскай педагагічнай скіраванасці на прыярытэтнае развіцце інтэлектуальна-пазнавальных здольнасцяў гуманістычная інтэнцыя эпохі на беларускіх землях першачарговы акцэнт зрабіла на маральна-грамадзянскае ўдасканаленне чалавека.

Адметнай асаблівасцю тагачаснай айчыннай педагагічнай думкі было тое, што пры распрацоўцы шляхоў фармавання прыстойнай асобы галоўная ўвага ўдзялялася выхаванню, як спецыяльна арганізаванаму працэсу. Гэта асабліва прасочваецца ў поглядах такіх слынных асветнікаў сярэднявечча, як Ф.Скарына, М.Гусоўскі, С.Будны, В.Цяпінскі, браты Зізаніі, Я.Намыслоўскі, С.Рысінскі, С.Полацкі і іншых. Сымон Будны прама заяўляў, што чалавечыя заганы — гэта вынік недахопу выхавання. Сімяон Полацкі сцвярджаў, што "добронравие" дзеці атрымліваюць не ў спадчыну ад бацькоў, а "с науки". Ён амаль на 20 гадоў раней за Д.Лока прыцягнуў увагу да адпаведных ідэй Арыстоцеля і заявіў аб адсутнасці ў чалавека прыроджаных маральных ідэй.

Падобныя падыходы знаходзілі адэкватнае адлюстраванне і ў практыцы работы многіх школ Беларусі. Архіўныя матэрыялы іх дзейнасці сведчаць аб значнай пераарыентацыі вучэбных устаноў у бок арганізацыі выхаваўчага працэсу. Школы пачынаюць разглядаць як "майстэрні чалавечых душ".

Педагагічныя ідэі заходнееўрапейскіх гуманістаў мелі даволі вузкую сацыяльную базу. Абвешчаны імі культ чалавека распаўсюджваўся ў асноўным на прадстаўнікоў вышэйшых слаёў грамадства. На беларускіх жа землях гуманістычная плынь з-за больш цеснай яе сувязі з рэлігіяй насіла адметна дэмакратычны характар, а ідэі гуманістычнай педагогікі, якія з'явіліся на гэтай глебе, у тым ліку і ідэі маральнага выхавання, мелі ярка выражаную агульначалавечую накіраванасць. Гэтым у пэўнай ступені, як бы дапаўняліся недастаткова рашучыя крокі ў напрамку секулярызацыі айчыннай этыка-педагагічнай думкі эпохі Адраджэння.

Маральна-выхаваўчыя ідэі беларусаў, як і іншых усходніх славян, у параўнанні з поглядамі заходнееўрапейцаў, вызначаюцца большай скіраванасцю да супольнасці, да абшчыннасці, да агульнага дабра. Служэнне "пожитку посполитому" ўводзіцца ў ранг вышэйшага крытэрыя маральнасці і вылучаецца ў якасці галоўнай задачы маральнага выхавання. Нават адраджэнчаскія працэсы з іх сцвярджэннем ідэй індывідуалізму на землях Айчыны далёка не дасягнулі таго ўзроўню, да якога яны ўзняліся ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе. Бо тут яны абазначылі варыянтнасць дасягнення ўласнага шчасця, уласнай дасканаласці, але і абавязкова ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра.

У педагагічнай думцы Беларусі, дзе такое прыярытэтнае месца адводзілася фарміраванню высокай духоўнасці, не зусім прыязна адносіліся да непамерных імкненняў чалавека да матэрыяльных даброт. І зусім катэгарычна асуджалася існаванне адных людзей за кошт іншых. "Сребролюбіе" лічылася надзвычай пажьўнай глебай для развіцця многіх чалавечых заган.

Не менш выразнай і характэрнай асаблівасцю выхаваўчых ідэй айчыннай педагагічнай думкі з'яўляецца накірунак прывіцця любві да Радзімы, да яе народа. Патрыятычныя памкненні прысутнічаюць у поглядах любога народа, але, мабыць, ні ў кога так, як ва ўсходніх славян, яны не набываюць такой устойлівасці і глыбіні, па якіх вымяраецца ўвесь сэнс жыцця чалавека. Прычым патрыятызм разумеецца не як абстрактная маральная якасць, а разглядаецца як актыўна-дзейсны бок жыцця індывіда. Гэтую думку пераканаўча выказаў Васіль Цяпінскі, які "з зычливости" да сваей Айчыны, дзеля яе "потребы" хоча быць практычна свайму народу "услугуючим". Такім чынам у айчыннай педагагічнай думцы гэтай маральнай якасці, як і многім іншым надаецца значны нацыянальна-дэмакратычны адценак.

*Ежы Нікітаровіч*

## АЛЬТЭРНАТЫВЫ ЗАХАВАННЯ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ АЎТЭНТЫЧНАСЦІ Ў РЭГІЁНЕ ПОЛЬСКА-БЕЛАРУСКАГА ПАМЕЖЖА

*г.Беласток*

Захаванне аўтэнтычнасці ў сферы культуры падтрымліваецца свядомай арыентацыей людзей на такія вызначальныя каштоўнасці, як матчына мова, веравызнанне, традыцыі, абапіраецца на рэгіянальныя асаблівасці жыццёвага ладу, гістарычную генеалогію, усведамленне сябе карэннымі насельнікамі гэтага краю. Лічым, што працэс фарміравання аўтэнтычнасці ў сферы культуры працякае ў рэгіёнах з высокім узроўнем канфесійна-этнічнай гамагеннасці інакш, чым у рэгіёнах гетэрагенных. У працэсе шматвекавога супольнага жыцця адметных канфесійных і этнічных груп у рэгіёне польска-беларускага памежжа склаліся многія спецыфічныя каштоўнасці, якія вызначаюць пэўную аўтэнтычнасць насельнікаў гэтага краю. Неадкладнай задачай сістэмы адукацыі павінна стаць азнаямленне навучэнцаў з супольным лёсам народаў, якія пражываюць на польска-беларускім памежжы, і зварот да патрэб захавання супольнай спадчыны культуры народаў памежжа.

Вынікі сацыялагічнага даследавання 598 сем'яў, што пражываюць на польска-беларускім памежжы, сведчаць аб тым, што ў іерархіі вызначальных каштоўнасцей, якімі кіруецца сям'я ў сацыялізацыйна-выхаваўчым працэсе, вышэй за ўсе шануюцца каштоўнасці асабіста-сямейныя. На другое месца былі пастаўлены каштоўнасці нацыянальна-этнічныя і канфесійныя і толькі пасля іх апынуліся каштоўнасці агульнаграмадскага і лакальнага характару. Менавіта таму нават рашучая ідэнтыфікацыя з беларускай народнасцю не цягне са сабою змену арыенціраў на выхаванне ў сям'і ў духу польскай культуры, але, з другога боку, абумоўлівае больш частае, чым у іншых сем'ях, карыстанне дзяцей этнічнай мовай і культывацыю традыцый бацькоў.

На нашу думку, прыналежнасць асобы да адной этнічнай групы не выключае магчымасці быць таксама членам другой этнічнай групы. Мы адхіляем аднамерную трактоўку аўтэнтычнасці і не падзяляем пункт гледжання, у адпаведнасці з якім нельга быць адначасова літоўцам і палякам, яўрэям і палякам, беларусам і палякам. Лічым, што мае месца бесперапынны працэс фарміравання і функцыянавання аўтэнтычнасці ў трыядзе: аўтэнтычнасць прыроджанага (натуральная) — аўтэнтычнасць ролі — аўтэнтычнасць Я.

У рэгіёне, дзе побач суіснуюць розныя культуры, жыццядзейнасць асобы адбываецца ў этнічна адметных калектывах. Таму члены этнічных ці канфесійных груп маюць магчымасць засвойваць каштоўнасці не адной, а дзвюх (і нават больш) культур, у адпаведнасці з чым у іх носьбітаў адбываецца канструяванне двaістай сістэмы каштоўнасцей. Яе індывідуальныя рысы праяўляюцца звычайна толькі ў пэўным сацыяльным кантэксце, але так, каб асоба заўсёды павінна мець мажлівасць выбару і самастойнага прыняцця рашэння аб сферы і ступені выкарыстання тых або іншых каштоўнасцей са сваей полікультурнай спадчыны, бо адным з вызначальных правоў чалавека з'яўляецца права выбару нацыянальнай прыналежнасці, як і вызначэнне ўласнай аўтэнтычнасці.

Вынікі даследавання дазволілі ажыццявіць тыпалагізацыю сем'яў памежнага рэгіёну ў залежнасці ад іх арыентацыі на пэўныя групы каштоўнасцей:

— сем'і, якім уласцівы этнацэнтрычны тып сацыялізацыі і выхавання, ізаляцыянізм і сепаратызм канфесійнага або этнічнага характару;

— сем'і, якім уласцівы дуалістычны тып сацыялізацыі і выхавання;

— сем'і, для якіх характэрна адсутнасць вызначанай культурна-адукацыйнай арыентацыі ў працэсе сацыялізацыі і выхавання;

— сем'і, у якіх мае месца адмаўленне ад уласнай этнічнай прыналежнасці на карысць культуры дамінуючай нацыі.

У адносінах да беларускага насельніцтва паўночна-ўсходняй Польшчы варта звярнуць увагу на наступныя аспекты:

— любоў да зямлі, да т.зв. малой радзімы — аспект пазітыўны, але "хлопкасць", вясковая ментальнасць — негатыўны;

— мова, якая дае пачуццё "свойскасці" — аўтэнтычнасць пазітыўная, але тое, што яна не ўжываецца па-за "сваімі", простая, "хахлацкая" — аспект негатыўны;

— праваслаўнае веравызнанне інтэгруе беларусаў краю, але руская мова святароў працуе на карысць "рускасці".